МІКАЛАЙ ПЛАВІНСКІ



# ПРЫГОДЫ ВАСІЛЬКІ З БРАЧЫСЛАЎЛЯ

МІКАЛАЙ ПЛАВІНСКІ

# ПРЫГОДЫ ВАСІЛЬКІ З БРАЧЫСЛАЎЛЯ



Мінск
«БЕЛАРУСЬ»
2016

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
П37

Для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Плавінскі, М. А.**

П37 Прыгоды Васількі з Брачыслаўля : для мал. і сярэд. шк. узросту / Мікалай Плавінскі. — Мінск : Беларусь, 2016. — 68 с. : іл.

ISBN 978-985-01-1184-5.

У кнізе апісваюцца прыгоды хлопчыка Васількі, які жыў у адным з гарадоў Полацкага княства ў пачатку XI стагоддзя. Разам з Васількам чытачы змогуць пападарожнічаць па лясных абшарах сярэднявечнай паўночнай Беларусі, даведацца, як жылі, пра што думалі, аб чым клапаціліся ў тыя часы нашыя продкі.

Кніга разлічана на дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту, на іх бацькоў і настаўнікаў, а таксама на ўсіх тых, каму цікавая гісторыя нашай Бацькаўшчыны.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-01-1184-5**

© Плавінскі М. А., 2016
© Афармленне.
«Выдавецтва «Беларусь», 2016

# Вясна

Васілька сядзеў на самай вяршыні стромкага вала, прытуліўшыся спінаю да таўшчэзных бярвёнаў гарадской сцяны, і майстраваў новым вострым ножыкам, які яму толькі пазаўчора падарыў бацька, дудачку з трыснягу. Яркае сонейка ззяла ў бясхмарным небе. Ужо колькі дзён стаяла цёплае надвор'е, ад чаго зямля зусім прачнулася пасля доўгае зімы, прагрэлася і пакрылася маладой, густой і сакавітай травой, а дрэвы апрануліся ў новае лісце і вось-вось ужо мусілі пайсці рознакаляровай квеценню.

Васілька дарабіў апошнюю адтуліну ў сваёй дудачцы і паспрабаваў зайграць. Мелодыя выйшла не надта гучнай, але хлопчык быў вельмі задаволены тым, што ў яго ўсё атрымалася. Ён сядзеў, грэўся на сонейку, граў на сваёй дудачцы, глядзеў на бязмежнае зіхоткае пад сонечнымі промнямі возера.

Васілька радаваўся вясне, бо гэта была ўжо дзясятая яго вясна. Яму шмат чаму давядзецца навучыцца будучым летам, стаць яшчэ спрытнейшым і мацнейшым. Хаця Васілька і так ужо самы моцны сярод сваіх аднагодкаў, і ніхто не наважваецца з яго кпіць



ці прыдумляць яму нейкія мянушкі. Але гэта і не дзіва, бо Васількаў бацька не нейкі там селянін ці рамеснік, а дружыннік. А таму Васілька ў той час, калі астатнія хлопцы і дзяўчаты пасвяць кароў, працуюць у полі ці яшчэ чым дапамагаюць бацькам па гаспадарцы, вучыцца трымаць у руках меч ці кап'ё, ці страляе з лука, ці проста займаецца рознымі фізічнымі практыкаваннямі. Яшчэ год таму Васілька вучыўся біцца з іншымі сынамі дружыннікаў, такога ж як ён узросту, толькі на драўляных мячах. І хоць меч у яго быў вельмі добры і трывалы, а на клінку хлопец сам выразаў знакі, такія ж, як на сапраўдных мячах, гэта ўсё ж была толькі цацка. Але некалькі месяцаў таму бацька ўпершыню дазволіў Васільку ўзяць у рукі сапраўдны меч, прычым не абы-які, а яго ўласны. А меч у Васількавага бацькі проста дзівосны, прывезены з ней-

кай далёкай краіны, што ляжыць за неабсяжным морам, у якое ўпадае магутная Дзвіна. Яго рукаяць аж зіхаціцца ад срэбра і медзі. А на клінку часам бачныя нейкія таямнічыя знакі, а часам іх амаль немагчыма разгледзець. Васілька зусім не мог зразумець, як такое можа быць. Але, калі бацька дазволіў яму ўпершыню самому ўзяць у рукі гэты меч, хлопчык быў настолькі шчаслівы, як напэўна яшчэ ніколі ў сваім жыцці.

Меч быў цяжкі, і спачатку ў Васількі не выходзіла доўга трымаць яго, тым больш наносіць нейкія ўдары. Але з дня ў дзень у яго атрымлівалася ўсё лепш, і ён сам адчуваў як мацнеюць рукі і наколькі спрытнейшым ён стае. Цяпер Васілька ўжо мог доўга практыкавацца з гэтай зброяй, амаль як дарослыя. Ён ужо марыў, што хутка, праз якія тры, ад сілы чатыры вясны, ён зможа стаць сапраўдным дружыннікам, такім жа, як яго бацька ці два старэйшыя браты.

Ён вельмі зайздросціў сваім братам, бо яны зараз былі далёка. Хлопчык паглядзеў на ўсход. Недзе там, дзе ўзыходзіць сонца, калі ехаць у той бок на кані некалькі дзён, стаіць на беразе шырокай Дзвіны вялікі горад Полацк. У гэтым горадзе валадарыць разумны і моцны князь Брачыслаў. Менавіта ён загадаў пабудаваць родны Васількаў горад, ад чаго той і называецца Брачыслаўлем. Гэта адбылося, калі Васілька яшчэ не нарадзіўся. Але ён добра ведае гэтую гісторыю, бо менавіта яго бацька кіраваў пабудовай новага горада.

Васілька толькі аднойчы быў у Полацку, з бацькам, але гэта здарылася даўно, калі яму ішла толькі пятая вясна. Таму ў памяці амаль нічога не засталося, толь-

кі асобныя абліччы людзей, толькі дзіўныя пахі і гукі. Ён памятаў, што людзей было вельмі шмат, проста безліч. Многія насілі зусім дзіўную вопратку, такую, якую Васільку больш ніколі не даводзілася бачыць. Ён таксама памятаў нейкія зусім невядомыя пахі, шмат дзіўных незнаёмых пахаў. А найбольш у дзіцячую памяць урэзаўся гук званоў, што клікалі вернікаў да набажэнства. Магутны гук здалёк чутны над хвалямі Дзвіны. Зусім не тое, што гук адзінага невялічкага звона ў царкве Брачыслаўля.

Вось у гэтым вялізным і амаль казачным горадзе цяпер і жылі абодва старэйшыя браты Васількі. І абодва яны былі дружыннікамі ў мудрага Брачыслава. Васілька страшэнна ім зайздросціў і хацеў найхутчэй далучыцца да сваіх братоў. Праўда дадому яны цяпер заязджалі ўсё радзей. Хіба што раз на год даводзілася бачыць старэйшага Мікулу і другога па ўзросце Дзімітра ў родным Брачыслаўлі. Але калі ўсё ж атрымлівалася ў іх завітаць дадому, дык усе хлапчукі зайздросцілі Васільку, бо ні ў кога больш не было такіх братоў. Магутныя, як асілкі, у аксамітавых кафтанах, расшытых срэбнымі вылогамі, з паясамі, упрыгожанымі срэбнымі накладкамі, і з такімі ж, як у бацькі, дарагімі мячамі. Адразу было бачна, што служаць яны сапраўды вялікаму князю — полацкаму Брачыславу.

А ўжо колькі дзівосаў распавядалі браты, седзячы ў святліцы з іншымі дружыннікамі. Па такім выпадку ў тую святліцу пускалі нават хлапчукоў — сыноў дружыннікаў, хаця зазвычай нават зазіраць туды ім было строга забаронена, каб раптам не атрымаць бізу-



на. Распавядалі, колькі рознага народу прыплывае па Дзвіне да Полацку — купцы, паслы, вучоныя людзі, вандроўнікі-пілігрымы. І з краіны шведаў, і з зямель франкаў, і з далёкага вострава Англіі. А часам дабіраюцца да Полацка і гандляры з краіны арабаў, у якіх смуглявая скура, чорныя валасы і зусім незразумелая мова.

Распавядалі таксама, што хоць Полацк і вельмі вялікі горад, але ёсць на Русі і яшчэ большыя, і называюцца яны Кіеў і Ноўгарад. Але ў гэта Васілька паверыць не мог нават сваім братам — хіба ж можа быць на свеце горад яшчэ большы за Полацк?

Васілька зачаравана ўтаропіўся ў далягляд на ўсходзе. Ён марыў пра тое, як ужо хутка, вельмі хутка ён зможа далучыцца да сваіх старэйшых братоў і так аддана і верна служыць мудраму князю Брачыславу.

Васілька ажно заплюшчыў вочы ад сваіх салодкіх мрояў, але нечакана пачуў голас маці, прыцішаны высокімі гарадскімі сценамі. Маці клікала яго абедаць. Васілька зірнуў на сонца і нават здзівіўся, як гэта ён здолеў не заўважыць, што ўжо прыйшоў час есці. Есці, а пасля зноў практыкавацца ў вайсковай справе, з апошніх сіл, да поўнай знямогі, каб быць такім жа, як старэйшыя браты, а можа нават амаль такім жа, як яго бацька. Хлопчык узняўся і спрытна пайшоў па адхоне вала ўздоўж гарадской сцяны ў бок брамы.

Увечары, лежачы на палацях і адчуваючы прыемную стомленасць у руках і нагах, Васілька слухаў, як роўна дыхае побач яго маленькая сястрычка Міла-

слава. Ён вельмі стаміўся ад розных ваярскіх практыкаванняў, бо стары Жызнамір, які вучыць дзяцей дружыннікаў вайсковай справе, ніколі не дае ім ні хвіліны роздыху. Дарма, што ён кульгавы, не мае левай рукі і бачыць толькі на адно вока. Але ж калісьці ў маладосці ён змагаўся яшчэ ў войску Рагвалода. Толькі, на жаль, ён так рэдка распавядае пра свае колішнія прыгоды. А заўтра Васількаў бацька разам з іншымі дружыннікамі едзе збіраць даніну з навакольных крывіцкіх вёсак. Таму ў Васількі пэўна не будзе зранку асаблівых хатніх спраў і можна будзе адпрасіцца ў маці, каб пашпацыраваць па наваколлі. Ён падумаў, што зможа нават дайсці да Дазорнай гары, з якой бачная амаль уся іх воласць. Васілька вырашыў, што так ён і зробіць, абняў сястрычку і імгненна заснуў.

# Крыніца

Калі Васілька прачнуўся, бацька з іншымі дружыннікамі ўжо з'ехаў. У небе зноў ззяла цёплае сонейка. Вясна больш ужо не збіралася адступаць. Васілька з'еў кашу з парным малаком і пачаў прасіць маці, каб адпусціла яго пагуляць за гарадскія сцены, бо надта ўжо яму хочацца пашпацыраваць па вясновым лесе.

Спярша яна, канешне, не хацела яго адпускаць. Маці казала, што ён яшчэ надта маленькі, каб аднаму далёка адыходзіць ад горада, і што ў лесе столькі ўсяго небяспечнага — і звяроў розных напаткаць можна, і людзей чужых нядобрых можна сустрэць, і, не дай бог, нячысцікаў напаткаць. Але Васілька звяроў не баяўся, бо калі ты сам звера турбаваць не станеш, то і ён на цябе не нападзе. Чужых людзей таксама баяцца няма чаго, бо адкуль ім тут узяцца ў зямлі князя Брачыслава, а калі і сустрэнецца які падарожны чалавек, то час зараз мірны, таму непакоіцца няма чаго. А ад нячысцікаў абараніцца яшчэ лягчэй, бо Васілька ж ходзіць у школу, дзе яны ўжо вывучылі столькі святых малітваў, што ніводзін нячысцік не стрывае, калі іх пачуе.

Урэшце, Васілька ўгаварыў маці адпусціць яго пагуляць, як яна ні ўпіралася. Маці ў яго добрая і звычайна ўсё яму дазваляе, хай, часам, і не адразу. Васілька паабяцаў, што вернецца не надта позна і яшчэ паспее пазаймацца сваімі вайсковымі практыкаваннямі. Маці дала яму ў дарогу вялікую лусту свежага хлеба і кавалак сала. Хлопчык паклаў іх у торбу, апрануў свае старыя поршні, бо, напэўна, шмат дзе яшчэ лясныя сцяжыны маглі быць гразкімі ад не так даўно расталага снегу, і выправіўся ў дарогу. Ён таксама ўзяў з сабой бацькава маленькае кап'ё, якое ўсе называюць суліцай. Дарослыя звычайна карыстаюцца такімі суліцамі на паляванні, каб пацэліць у падпільнаванага звера зблізу. А дружыннікі бяруць такія суліцы і на бітву, каб кідаць іх у ворага. Але для Васількі бацькава суліца была па памеры амаль як сапраўднае кап'е. Да таго ж, стары Жызнамір ужо навучыў Васільку і яго аднагодкаў далёка і трапна кідаць такія суліцы. Таму Васількавай маці будзе спакайней думаць, што ў выпадку якой неспадзяванкі яе сын зможа абараніцца. А самому хлопчыку было дужа прыемна разумець, што ён выпраўляецца ў вандроўку з сапраўднай зброяй у руках.

Васілька выйшаў за гарадскую браму і пашыбаваў на поўнач. Вакол дарогі, пратаптанай людзьмі ды жывёламі, уздымалася сакавітая маладая трава. Хлопчык разуўся і пабег па роснай траве, халоднай, але вельмі прыемнай. Здаволіўшыся, ён зноў абуў свае старэнькія поршні і пайшоў спакойнай размера-

най хадой, бо да Дазорнай гары трэба ісці болей за чатыры гадзіны, калі не ўсе пяць.

Васілька ішоў па сцежцы, якая ў хуткім часе патанула ў зарасніку дрэў і кустоў. Брачыславль схаваўся ў перапляценні галля. Васілька ішоў хутка і вельмі радаваўся таму, што ён змог адпрасіцца ў гэтую вандроўку. Сцежка ўвесь час ішла на поўнач,



уздоўж берага вялікага возера, якое людзі называюць Струста. Месцамі яна набліжалася да самага берага, і тады Васільку даводзілася здымаць абутак, а часам і штаны, бо вада яшчэ стаяла даволі высока і была яшчэ халодная. Але хлопчык зусім не засмучаўся.

Калі Васілька прайшоў ужо амаль тры чвэрці свайго шляху, яму вельмі захацелася пад'есці. Ён сеў на паваленае дрэва, адрэзаў некалькі скрылёчкаў сала і адламіў палову лусты хлеба. Пад'еўшы і крыху адпачыўшы, Васілька захацеў піць. І хоць возера было зусім побач, ён вырашыў, што пап'е не азёрнай вады, а іншай, яшчэ больш чыстай і, як кажуць сталыя людзі, цудадзейнай. Васілька пакрочыў наперад, але праз якія дзвесце крокаў збочыў са сцежкі направа, у самы зараснік. Здавалася, тут людзі ўвогуле ніколі не хадзілі, але ён ведаў, што менавіта тут пачынаецца іншая сцежка, якая вядзе да святой крыніцы. І сапраўды, вось яна. Мяркуючы па ўсім, пасля таго, як растаў снег, тут паспела пабываць ужо вельмі шмат народу з навакольных вёсак, ды і з самога Брачыслаўля, напэўна. І нічога з гэтым не можа зрабіць іх брачыслаўскі поп Лазар. Колькі ён ні вучыць людзей, што маліцца старым багам, крыніцам ды валунам — вялікі грэх і што малітвы варты толькі адзіны Бог, аддаўшы жыццё на крыжы за выратаванне людзей, але яны ўсё роўна прыходзяць і моляцца.

Літаральна праз сотню крокаў сцяжынка вывела Васільку на зусім невялічкую паляну. Пасярод яе з зямлі выбівалася крынічка, якую ўсе называюць

Акмяніца. Вада ў гэтай крыніцы заўжды сцюдзёная і надзвычай смачная, а старыя людзі ўвогуле лічаць яе святой. Галіны дрэў, што раслі навокал паляны, былі абвешаныя рознымі дзіўнымі рэчамі. Чаго тут толькі ні было: рознакаляровыя стужачкі і анучкі, бронзавыя званочкі і абярэгі, каралі са шкляных пацерак і нават манет, падвешаныя на шнурках. Многія з гэтых рэчаў віселі тут даўно і зусім пацямнелі ад часу, але былі і зусім новыя стужкі, якія нехта прывязваў ужо гэтай вясной. Відаць, шмат хто ў наваколлі працягвае прыходзіць да крыніцы памаліцца і папрасіць у яе хацяб крыху жыватворнай сілы. І як ні змагаецца з гэтай верай поп Лазар, але людзі працягваюць сюды патаемна прыходзіць зноў і зноў. Нават маці Васількі хаця б раз на год абавязкова хадзіла да Акмяніцы, малілася тут, а пасля прыносіла дадому збаночак крынічнай вады, якую потым выкарыстоўвала, каб лекаваць розныя хваробы.

Васілька папіў сцюдзёнай вады, падзякаваў Акмяніцы і пашыбаваў далей, у бок Дазорнай гары. Да яе заставалася ўжо зусім няшмат, не болей за гадзіну хады.

Нарэшце Васілька дабраўся да Дазорнай гары. Гэта сапраўды было самае высокае месца ва ўсім наваколлі. На вяршыні гары было складзена шмат дроў і галля. У час варожага нападу мясцовыя жыхары падпальвалі гэтае голле, і дым ад яго быў бачны не толькі ў Брачыслаўлі, але і амаль ва ўсіх крэпасцях брачыслаўскай воласці, і ўсе ведалі, што набліжаецца вораг і трэба хутка рыхтавацца да абароны.

Але ж які цудоўны від адкрываўся адсюль. Амаль з усіх бакоў Дазорная гара была аточаная вялізнымі азёрамі са шматлікімі выспамі. Берагі іх зараслі лесам, і толькі ў некалькіх месцах бачныя асобныя невялічкія вёскі. Васільку вельмі падабалася глядзець на ўсё гэтае хараство, але, убачыўшы, наколькі ўжо высока ўзнялося ў неба сонца, ён зразумеў, што варта хутчэй вяртацца дадому, бо іначай ён спозніцца і яму добра дастанецца на гарэхі ад старога Жызнаміра і ад бацькі, калі той рана вернецца дадому. Хлопчык апошні раз агледзеў навакольнае хараство, падняўся і пашыбаваў дахаты.

# Навука

Як ні спяшаўся Васілька да Брачыслаўля з Дазорнай гары, але так і не паспеў дабрацца ў час. Добрую частку дарогі ён нават бег, але ўсё роўна моцна запазніўся. Калі ён нарэшце дабраўся да горада, прайшла ўжо цэлая гадзіна, як Жызнамір пачаў свае практыкаванні з іншымі хлопчыкамі. Але, калі змораны Васілька дабег да таго месца, стары не стаў сварыцца, а толькі загадаў яму апрануць скураную куртку, узяць цяжкі дарослы шчыт і яго, Васількаву, суліцу і прабегчы пяць разоў уздоўж усяго брачыслаўскага вала, каб была яму навука на будучае.

Васілька бег з апошніх сіл. Страшэнна хацелася спыніцца і ўпасці на зямлю. Але тады іншыя хлопцы пачалі б з яго смяяцца, а такога дапусціць было нельга. Але, калі Васілька ўжо адужваў сваё пятае кола, у горад уехаў яго бацька са сваімі спадарожнікамі. Бацька, здаецца, і не звярнуў увагу на тое, што адбываецца, але хлопчыку стала дрэнна ад аднаго яго позірку.

Нарэшце Васілька дабег да месца жызнаміравых заняткаў. Ён быў зусім змораны, але яму адразу ж да-

вялося ўзяць драўляны меч і працягнуць заняткі поруч з іншымі хлопцамі, нібы нічога да гэтага і не было.

Калі практыкаванні скончыліся, Васілька быў амаль нежывы і ледзь ішоў дадому. Ён нават не хацеў есці і думаў адразу класціся спаць, але не атрымалася. Бацька, канешне ж, даведаўся пра яго вандроўку, і Васілька ўжо падрыхтаваўся атрымаць бізуна. Але сталася інакш. Бацька зусім не сварыўся, але прымусіў хлопчыка пяцьдзясят разоў адціснуцца ад зямлі. Пасля гэтага Васілька толькі і змог, што дацягнуцца да палацяў і зусім без сілаў упасці спаць.





Але і назаўтра выпрабаванні Васількі не скончыліся. Зранку ён павінен быў ісці вучыцца пісаць і лічыць. Заняткі праводзіў айцец Лазар у сваёй царкве. Звычайна яны цягнуліся гадзіны дзве. Вучні пісалі на адмысловых драўляных дошчачках, пакрытых воскам, пры дапамозе бронзавых палачак, у якіх адзін край зроблены вострым, а другі — расплюснутым. Вострым краем можна пісаць на воску, а пляскатым — разгладжваць напісаныя літары.

Звычайна Васілька з радасцю хадзіў на заняткі да айца Лазара, бо яму падабалася пісаць і лічыць. У яго ўжо вельмі добра атрымлівалася складаць словы з асобных літар, а чытаў і лічыў ён ужо зусім добра.

Але ў гэты дзень навука Васільку была не даспадобы, бо пасля таго, як для ўсіх заняткі скончыліся, айцец Лазар пакінуў яго і прымусіў яшчэ цэлыя тры гадзіны запар перапісваць малітвы з вялікай кнігі на яго дошчачку, сціраць напісанае і зноў перапісваць. Перапісванне гэтае было надта сумным, бо ўсе малітвы Васілька і так ведаў на памяць, а на вуліцы было такое цудоўнае надвор'е, і ўсе яго сябры, напэўна ж, увесь гэты час бавілі ў нейкіх гульнях. Але, што зробіш, да малітвы нельга ставіцца непаважна. Таму Васілька старанна выводзіў па воску літары, пакуль, нарэшце, айцец Лазар не адпусціў яго, наказаўшы, каб болей ён так далёка адзін і без бацькавага дазволу ніколі з Брачыслаўля не сыходзіў.

# Ганец

Прайшло ўжо пяць дзён, як Васілька на сваю бяду выправіўся ў вандроўку на Дазорную гару, але ў яго дагэтуль працягвалі балець усе мышцы рук і ног. Усё яшчэ адчувалася Жызнамірава і бацькава навука. Мала таго, усе наступныя дні стары Жызнамір пасля агульных заняткаў, калі ўжо адпускаў усіх іншых хлопчыкаў, прымушаў Васільку практыкавацца ў розных вайсковых майстэрствах. Вось і сёння, калі ўжо ўсе пайшлі дадому вячэраць, Васілька мусіў яшчэ амаль цэлую гадзіну практыкавацца ў спрытнасці. Жызнамір узяў доўгі дубец, даў хлопчыку шчыт і драўляны меч і прымусіў абараняцца. І хаця стары Жызнамір быў кульгавы, аднарукі і меў толькі адно вока, Васільку так дасталося дубцом, што ў яго цяпер ажно гарэлі рукі, плечы і ногі.

Але зараз Васілька, нарэшце, меў вольны час і змог пагуляць са сваімі сябрамі. Гулялі яны ў біты. Такія біты робяцца з каленных костак розных буйных жывёл — коней, кароў ці свіней. Знізу ў такой костцы робіцца паглыбленне, куды заліваецца свінец, каб біта была цяжэйшай. Сэнс гульні ў тым, каб сваёй бітай збіць як мага больш чужых. У Васількі была вельмі

добрая біта, цяжкая і прыгожая ад таго, што зверху ён выразаў на ёй сваё імя, каб раптам ніхто не паспрабаваў яе падмяніць ці сцягнуць.

Сёння Васільку вельмі шчасціла ў гульні, усё ў яго атрымлівалася, і ён так загуляўся, што ледзьве не прапусціў той момант, калі ў браму Брачыслаўля ўехаў незнаёмы хлопец. Быў ён малады, але, мяркуючы па багатай вопратцы, аздобленай срэбнымі накладкамі, на якіх вісеў меч, і вельмі прыгожай аброці, таксама ўпрыгожанай каштоўнымі накладкамі, быў ён ужо паважным дружыннікам, можа нават амаль такім, як яго браты. На шыі ў хлопца вісела срэбная пласцінка са знакам князя Брачыслава. Варта, пабачыўшы княжацкі знак, прапусціла яго, і хлопец адразу ж скіраваўся да Васількавага дома, адкуль ужо выйшаў яго бацька.

Зразумела, што дзеці адразу ж кінулі сваю гульню і пабеглі глядзець на госця. Але далей за брамку Васількавага двара ніхто зайсці не наважыўся, бо бацьку Васількі хлопчыкі пабойваліся. Яны збіліся ў купку і здаля разглядалі ўбранне каня, на якім прыехаў дружыннік з Полацка. А Васілька, канешне ж, адразу забег у хату, каб паглядзець на нечаканага госця. Але шмат ён разгледзець не паспеў, бо, як толькі ганец напіўся вады, яны з Васількавым бацькам адразу пайшлі ў вялікі дом са святліцай, дзе засядалі брачыслаўскія дружыннікі. Васілька адразу зразумеў, што ганец прывёз з Полацка нейкія важныя навіны ці нават даручэнні ад самога князя Брачыслава.

Як жа Васільку хацелася патрапіць у святліцу, куды сталі збірацца ўсе дружыннікі, але ён добра ведаў, што гэта ў яго ніяк не атрымаецца, таму ён пайшоў да сваіх сяброў, каб працягнуць гульню. Але гуляць ужо ніхто не хацеў, хлопчыкі толькі і рабілі, што абмяркоўвалі вопратку і зброю полацкага дружынніка, яго каня і меркавалі, чаму ж ён прыехаў да Брачыслаўля і якія навіны прывёз. У гэтых размовах і прайшоў вечар, пакуль маці не пачалі клікаць іх вячэраць.



# Нечаканая радасць

Гэтым вечарам бацька вярнуўся дадому позна, калі ўжо зусім сцямнела. Вячэраць ён не стаў. Але сеў за стол, наліў сабе квасу і нечакана паклікаў да сябе Васільку, які ўжо амаль што паклаўся спаць побач са сваёй сястрычкай. Бацька пасадзіў хлопчыка побач з сабой і раптам спытаў:

— Ну што, сынок, хочаш са мной у далёкую выправу?

Васілька настолькі здзівіўся такому пытанню, што спачатку амаль не паверыў пачутаму. Ён толькі і змог сказаць:

— Канешне, хачу!

Бацька шырока ўсміхнуўся, зрабіў вялікі глыток квасу, выцер свае доўгія вусы і сказаў:

— Вось і добра, ты ў мяне ўжо зусім вялікі, таму час табе паспытаць сапраўднага дружыннага жыцця. Паслязаўтра мы рушым у далёкі шлях на поўдзень. Выправімся, можа, нават на цэлы месяц. Я сёння атрымаў загад ад князя Брачыслава.

Васілька быў проста ў захапленні і толькі ўскрыкнуў:

— Выдатна!

Але тут з кута, ад агменю загаварыла маці:

— Людаслаў, ты што ж гэта? Ён жа яшчэ зусім маленькі! Куды ж ты яго хочаш браць, ды яшчэ так надоўга? Хай яшчэ падрасце.

Васілька абурыўся і хацеў адказаць маці, што ён ужо дарослы, але не паспеў, бо бацька сказаў сваё слова першым:

— Не, жонка, яму трэба вучыцца. Час зараз мірны, небяспекі на шляхах няма, а для яго гэта будзе выдатным досведам. Я ўжо ўсё вырашыў.

Маці толькі глыбока ўздыхнула, але сказаць нічога не адважылася.

— А цяпер спаць! Заўтра будзе шмат турботаў, — сказаў бацька, ускудлаціў Васількавы валасы і задзьмуў свечку на стале.

Васілька хуценька пайшоў спаць, але заснуць адразу, канешне ж, не змог. Яго проста распірала ад радасці прадчування далёкай дарогі і нечаканых сапраўдных дарослых прыгод.

Наступны дзень прайшоў у турботах і клопатах. Маці завіхалася па гаспадарцы — збірала ў дарогу ежу і розныя неабходныя рэчы для Васількі і яго бацькі і ўсё ўздыхала, што рана яму яшчэ кудысьці ехаць. Але Васілька спакойна слухаў матчыны ўздыхі, бо ведаў, што бацька ўжо ўсё вырашыў і не перадумае, нягледзячы ні на якія адгаворы.

Васілька з самага ранку дапамагаў бацьку і іншым дружыннікам рыхтаваць да выправы коней і іх рыштунак. Пасля бацька дазволіў яму пачысціць зброю і нават свой уласны меч! Нарэшце хлопчык сабраў

сваe ўласныя рэчы — вопратку, розныя прысмакі, якія адмыслова падрыхтавала для яго маці, агледзеў і пачысціў суліцу і невялічкую сякерку, якую яму даў бацька.

Пасля абеду Васілька пабег на заняткі да Жызнаміра. У гэты дзень ён займаўся ўсімі практыкаваннямі з патройнай ахвотай, бо думаў аб тым, што раптам ужо заўтра давядзецца выкарыстоўваць ваярскую навуку на практыцы. А яшчэ Васільку было страшэнна прыемна бачыць, з якой зайздрасцю глядзяць на яго іншыя хлопчыкі… І не дзіва, кожны з іх аддаў бы ўсё, што заўгодна, каб апынуцца зараз на Васількавым месцы.

Увечары маці прыгатавала вельмі смачную вячэру і ўсё ўздыхала, што Васільку не будзе чаго есці ў дарозе. А бацька толькі шырока пасміхаўся ў адказ. Пасля вячэры ён пайшоў праверыць, ці падрыхтавана ўсё да выправы, а таксама аддаць тым дружыннікам, хто застаецца ў Брачыславўлі, апошнія загады на час сваёй адсутнасці.

А Васілька разам з сястрычкай пайшлі спаць. Міласлава папрасіла, каб ён распавёў ёй нешта перад сном, і Васілька стаў пераказваць ёй тую частку «Святога Пісання», якую яны апошнім часам чыталі на ўроку ў айца Лазара. Сястрычка заснула вельмі хутка, а вось Васілька не мог заснуць амаль да самага досвітку, хаця ён і ведаў, што трэба выспацца і набрацца сіл перад дарогай. Але як тут заснуць, калі толькі заплюшчваеш вочы, як адразу пачынаюць мроіцца невядомыя лясныя сцежкі, рачныя броды, вёскі і гарады…

# Выправа

На досвітку бацька пабудзіў Васільку і яны селі снедаць. Маці ўсё ўздыхала, і было бачна, што яна зусім не хоча адпускаць сына з дому. А бацька быў, відавочна, вясёлы, бо сам даўно не выбіраўся надоўга са свайго горада.

Паснедаўшы, Васілька з бацькам пайшлі на двор, дзе ўжо стаялі чатыры зацугляныя кані — вялікі і прыгожы бацькавы, меншы, але таксама вельмі ладны для яго, і яшчэ два, якія павінны былі везці розную паклажу ды зброю. А калі раптам давялося б спяшацца і ехаць вельмі хутка, дык на гэтых коней можна было б перасесці, каб даць адпачыць першым двум. Амаль увесь іх паходны рыштунак і прыпасы ўжо былі сабраныя і прыладжаныя да сёдлаў. Васілька нават здзівіўся: і калі гэта бацька мог усё паспець? Хіба што ён таксама амаль не спаў гэтай ноччу.

На ганак выйшла маці. Яна сумна назірала за апошнімі прыгатаваннямі. А бацька ўсё падбадзёрваў яе і шмат жартаваў. Нарэшце ўсе рэчы былі сабраныя і можна было выпраўляцца. Бацька абняў маці, моцна пацалаваў і гарэзліва сказаў:

— Ну што, жонка, чакай ваяроў з перамогай! І месяца не пройдзе, як мы вернемся.

— Ай, ну цябе… Вы галоўнае сябе беражыце ў дарозе! — адказала маці. — І за Васількам сачы, бо малы ён яшчэ.

Пакуль яны так размаўлялі, Васілька паспеў забегчы ў хату, каб абняць сястрычку, якая яшчэ соладка спала, агледзеўся, згадаў, што ледзь не забыўся пра



сваю дудачку, што так доўга майстраваў, паклаў яе ў торбу і заспяшаўся на вуліцу. Калі ён выйшаў на ганак, бацька ўжо сядзеў на кані. Васілька падбег да маці. Яна абняла хлопчыка, пацалавала і перахрысціла на дарогу.

— Ну досыць ужо, — сказаў бацька, — час выпраўляцца.

Васілька падбег да свайго коніка, спрытна ўскочыў у сядло, і яны з бацькам накіраваліся ў бок гарадской брамы.

Горад паціху прачынаўся, і ў кожным двары гаспадары ўжо займаліся сваімі справамі. Усе віталі Васількавага бацьку і жадалі ім добрай дарогі. Ля брамы іх ужо чакалі пяцёра дружыннікаў. У кожнага з іх таксама было па два кані, нагружаныя розным рыштункам. Побач з вершнікамі стаяў дзядзька Давыд, якога Васількаў бацька пакідаў замест сябе сачыць за гарадскімі справамі і за аховай межаў іх воласці. Яны крыху паразмаўлялі, Васількаў бацька даў Давыду апошнія даручэнні, пасля агледзеў сваіх спадарожнікаў і загадаў выпраўляцца.

І вось, нарэшце… Іх невялічкі атрад выехаў за гарадскую браму і скіраваўся на ўсход, па дарозе, якая пралягла ўздоўж возера.

Васілька быў сам не свой ад шчасця! Сапраўдная далёкая выправа. Гэта колькі ж усяго ён зможа пабачыць, колькі будзе прыгод! Толькі зараз хлопчык зразумеў, што ён нават ні разу не запытаўся ў бацькі, куды менавіта яны едуць і навошта. Але, зрэшты, якая

розніца? Усё роўна гэта самая неверагодная прыгода ў яго жыцці, сапраўдная дарослая ваярская прыгода!

Хутка сцены Брачыслаўля схаваліся за лесам. Васілька ехаў побач з бацькам і разглядаў наваколле. Мясціны гэтыя былі добра знаёмыя, але ж гэтым разам, нейкія надзвычай прыгожыя і, адначасова, незвычайна таямнічыя. Настрой у хлопчыка быў проста цудоўны. Ды і бацька з яго дружыннікамі былі, відавочна, у гуморы. Яны гучна перагаворваліся і жартавалі. З размоў Васілька зразумеў, што шлях іх скіроўваецца на поўдзень.

Чым далей яны ад'язджалі ад Брачыслаўля, тым радзей былі бачныя палеткі і статкі на выганах, а чалавечае жытло сустракалася зусім рэдка. У адным месцы яны праехалі праз могілкі, якія былі раскіданыя паабапал дарогі. Васілька ўжо бачыў такія могілкі, калі ездзіў разам з бацькам па іх брачыслаўскай воласці. Мясцовыя жыхары хавалі сваіх нябожчыкаў у звычайных курганах, але яны спальвалі сваіх памерлых, а пасля складалі спаленыя косткі ў невялічкія дамкі на вяршынях гэтых курганоў. Мяркуючы па тым, што на некаторых курганах такія дамкі былі пастаўлены зусім нядаўна, мо ў мінулым ці пазамінулым годзе, мясцовыя трымаліся старых звычаяў і працягвалі спальваць памерлых. І нічога з гэтым не мог зрабіць ні іх брачыслаўскі святар, ні манахі, якія раз-пораз прыязджалі ў іх воласць з самога Полацка, каб прапаведаваць хрысціянскую веру сярод вясковых жыхароў. Васілька не разумеў, як жа спаленыя нябожчыкі змогуць узняцца са сваіх магіл падчас прышэсця сапраўд-

нага Бога, і вельмі пужаўся такіх месцаў. Але зараз ён быў побач з бацькам ды іншымі дружыннікамі і вырашыў не паказваць выгляду, што спалохаўся. Ён толькі перажагнаўся, каб абараніцца ад злых духаў ды ад бедных непрытульных душ, якім не наканавана пабачыць божае царства на нябёсах.

Чым далей, тым менш наезджанай станавілася дарога, па якой яны ехалі. Месцамі яна амаль зусім знікала і ператваралася ў звычайную лясную сцяжынку. Бачна было, што вершнікі тут ездзілі зусім рэдка, ды і пешыя крочылі па ёй, пэўна, не кожны дзень. Таму іх невялічкі атрад рухаўся зусім марудна. Васілька пільна ўглядаўся ў лясныя нетры і думаў, якія таямніцы і небяспекі могуць хавацца ў іх. «Напэўна ж і розныя нячысцікі тут таксама ёсць», — думаў хлопчык. Час ад часу сцежку, па якой яны ехалі, перасякалі ручаіны і рэчкі, праз якія яны перапраўляліся ўброд, не злазячы з коней.

Калі сонца стала хіліцца да захаду, яны дабраліся да мяжы брачыслаўскай воласці і Васількаў бацька сказаў, што варта спыніцца на начлег. Для начной стаянкі абралі месца на беразе невялічкага возера. Трое дружыннікаў узялі лукі з калчанамі і рушылі ў глыб лесу, каб упаляваць нешта на вячэру. Двое астатніх займаліся коньмі. А Васількаў бацька заняўся вогнішчам. Васілька вельмі стаміўся ад нязвыкла доўгай дарогі, але таксама стаў дапамагаць бацьку — збіраў галлё і дровы для вогнішча.

Хутка на азёрным беразе ўжо палаў яркі агонь. Вечар быў цёплы, а неба бясхмарнае, таму выра-



шылі не ставіць на ноч намёт, а спаць, загарнуўшыся ў цёплыя ваўняныя плашчы. Калі ўжо напаілі коней, стрыножылі іх і пусцілі пасвіцца на беразе, вярнуліся паляўнічыя са сваёй здабычай. Гэта была маладая казуля! Яе тушу хутка разабралі і пачалі смажыць!

Калі стала змяркацца, вячэра была гатова. Смажанае мяса елі з хлебам зусім яшчэ свежым, напечаным толькі ўчора ўвечары. Якая ж гэта была смаката! Канешне, Васількава маці гатавала смачней за ўсіх у іх Брачыслаўлі, але гэтая вячэра была проста цудоўная, сапраўдная паходная ваярская вячэра. Дружыннікі елі, запівалі мяса хмяльным мёдам, якога Васільку не дасталося.

— Малы ты яшчэ, — сказаў яму бацька.

Наеўшыся ўдосталь дружыннікі загаманілі пра тое, што час для выправы добры і, калі надвор'е не сапсуецца, яны дабяруцца да месца, куды едуць, дзён за шэсць. Старэйшы з дружыннікаў, Ян, зацягнуў старажытную ваярскую песню, а пасля дастаў свой варган — невялічкую жалезную скабу з язычком, уставіў у рот і зайграў. Над возерам разнеслася цягучая мелодыя. Пад гэтыя гукі Васілька незаўважна для сябе заснуў. Прачнуўся ён толькі тады, калі адчуў, што бацька загортвае яго ў плашч. Хлопчык толькі пачуў, як адзін з дружыннікаў ціха сказаў:

— Змарыўся малец.

— Не дзіва, першы раз у дарозе, — адказаў другі.

І Васілька зноў соладка заснуў.

# Гарадзец

Два наступныя дні яны былі ў дарозе. Другую ноч зноў правялі пад адкрытым небам. Васілька таксама стаміўся, але ўжо менш, чым за першы дзень, а таму заснуў не адразу і крыху пасядзеў ля вогнішча з дарослымі і паслухаў гутаркі пра мінулыя выправы і бітвы аб далёкіх краях і вялікіх чужых гарадах. Больш за ўсё гісторый распавядаў, канешне, Васількаў бацька, бо ён быў старэйшы за астатніх і самы дасведчаны ў ваярскай справе.

На трэці дзень выправы сцежка, па якой яны ехалі, стала зноў паступова ператварацца ў наезджаную дарогу, па баках якой сталі ўсё часцей з'яўляцца разараныя палеткі, на якіх працавалі людзі. Спачатку, пабачыўшы ўзброеных вершнікаў, яны насцярожваліся, а некаторыя жанчыны нават пужаліся. Але зразумеўшы, што гэта не нейкія іншаземцы ці, барані бог, ворагі, радасна віталі Васількавага бацьку і яго спадарожнікаў. У хуткім часе на іх шляху сталі раз-пораз трапляцца невялікія вёсачкі, зусім такія ж, як у ваколіцах Брачыслаўля. А бліжэй да вечара атрад дабраўся да горада, які, як патлумачыў Васільку бацька, называўся Гарадзец.



Гарадзец таксама, як і родны Васількаў Брачыслаўль, быў умацаваны высокім валам і магутнымі драўлянымі сценамі, але выглядаў зусім інакш. Ён размяшчаўся на высокім беразе хуткацечнай ракі.

Ля гарадской брамы іх сустракала некалькі дружыннікаў, сярод якіх вылучаўся багатым адзеннем пасівелы мажны мужчына з вялікім жыватом, які быў аднаго ўзросту з Васількавым бацькам. Васілька зразумеў, што гэта мясцовы гаспадар. Ён зірнуў на бацьку і пабачыў, як той шчыра пасміхаецца: было бачна, што гэта яго стары і добры знаёмы.

І сапраўды, як толькі іх атрад наблізіўся да гарадской брамы, Васількаў бацька саскочыў з каня і кінуўся ў абдымкі да ссівелага гарадзецкага гаспадара, а пасля весела сказаў:

— Даўно я цябе не бачыў, Навуме! Ты ўсё круглееш, пэўна справы ў Гарадцы ідуць някепска.

— І не кажы, — засмяяўся Навум. — А вось ты зусім не мяняешся, Людаслаў. Не бярэ цябе час.

Пасля гаспадар агледзеў спадарожнікаў Васількавага бацькі і спыніў позірк на ім, на Васільку.

— А гэта што за малец? — спытаў Навум. — Надта ён на цябе, Людаслаў, падобны. Хіба гэта твой малодшы?

— Так, сапраўды, мой, ужо амаль зусім дарослы, — адказаў Васількаў бацька. — Але што гэта, Навуме, ты нас перад брамай трымаеш, як нейкіх сватоў наўгародскіх. Запрашай ваяроў да стала, хіба не бачыш, што мы змораныя ад доўгага шляху?

— А хто ж вас трымае? — з усмешкай спытаў гаспадар. — Самі заязджаць не спяшаецеся, а ў мяне ў святліцы ўжо даўно сталы накрытыя ды мёд па чарах разліты.

І яны з Васількавым бацькам рушылі ў горад. За імі пацягнуліся мясцовыя дружыннікі разам са спадарожнікамі Васількі, які толькі і паспяваў круціць галавой ва ўсе бакі, бо ўсё навокал было, на першы погляд, вельмі падобнае да яго роднага Брачыслаўля, але адначасова і нейкае іншае. Гарадзец быў меншы за Брачыслаўль, а таму дамы ўнутры гарадскога вала стаялі амаль ушчыльную адзін да аднаго, а падворкі былі зусім невялічкімі. Васілька вельмі здзівіўся, дзе ж тут можна трымаць жывёлу, калі і для людзей месца амаль зусім няма.

У цэнтры Гарадца меўся зусім невялічкі пляц, выкладзены доўгімі дошкамі, па баках ад якога размяшчаліся царква, падворак Навума і дом з вялікай святліцай, дзе збіраліся мясцовыя дружыннікі.

Сонца ўжо амаль схілілася на захад. Васілька дапамог Яну і іншым дружыннікам рассядлаць коней, а пасля разам з імі пайшоў у святліцу, дзе ўжо сядзелі мажны Навум і яго бацька, а таксама ўсе гарадзецкія дружыннікі. Доўгі стол быў застаўлены вялікімі драўлянымі міскамі з ежай. Калі ўсе расселіся па лаўках, Васільку дасталося месца на краі стала, у самым куце святліцы. Нягледзячы на стомленасць ад трохдзённай дарогі вярхом, хлопчык быў вельмі ўсхваляваны, бо ён упершыню ў жыцці сядзеў на сапраўдным

піру з дарослымі ваярамі, ды яшчэ і ў іншым горадзе. Ён адчуваў сябе па-сапраўднаму дарослым.

Дружыннікі з апетытам елі і перадавалі па крузе брацiну — вялізную драўляную разьбяную чару з мёдам. Ручка чары была ўпрыгожана галавой нейкага драпежнага звера, якога менавіта Васілька не мог разгледзець, бо да яго чара не даходзіла. Людаслаў і Навум абменьваліся навінамі аб жыцці сваіх валасцей, аб тым, што робіцца ў Полацку ды іншых гарадах княства Брачыслава. Васілька ўслухоўваўся ў гэтую размову, але да яго далятаці толькі асобныя словы, бо чым далей брацiна хадзіла па крузе, тым больш моцным станавіўся гоман захмялелых дружыннікаў. Але хлопчык усё ж зразумеў, што полацкі князь рыхтуецца да вялікай вайсковай выправы, і менавіта таму Васількаў бацька, адзін з самых дасведчаных ваяроў Брачыслава, зараз аб'язджае памежныя гарады і аглядае, у якім стане знаходзяцца іх умацаванні і колькі ваяроў можна будзе сабраць у гэтую выправу.

Удосталь наеўшыся, Васілька загарнуўся ў мядзведжае футра, якое ляжала на лаўцы, і прытуліўся да сцяны. Ён слухаў гутаркі дружыннікаў і ўяўляў, як бацька возьме яго разам з сабой у далёкую выправу, як ён пабачыць князя Брачыслава, колькі ўсяго ён зможа даведацца і якія подзвігі зможа здзейсніць. З гэтымі салодкімі марамі Васілька і заснуў.

# Раптоўная небяспека

Калі Васілька прачнуўся ўранку, у святліцы ўжо нікога не было. Хлопчык хуценька падняўся і пабег на двор. На гарадскім пляцы кіпела праца. Васількавы спадарожнікі завіхаліся ля ўжо асядланых коней і прыладджвалі да сёдлаў рыштунак і зброю. Бацька разам з Навумам стаялі ля ўвахода ў царкву і размаўлялі з мясцовым святаром. А ўсе завулкі, што выходзілі з розных бакоў на цэнтральны пляц Гарадца, былі забітыя мясцовымі хлапчукамі і дзяўчынкамі. Былі тут і зусім малыя дзеткі, і Васількавы пагодкі, і нават старэйшыя за яго мальцы і дзяўчаткі. Усе яны з цікавасцю сачылі за прыгатаваннямі брачыслаўскіх дружыннікаў. А калі яны пабачылі Васільку, у іх вачах заззяла шчырая зайздрасць і ўсе пачалі перашэптвацца і паказваць на яго пальцамі.

Васілька зрабіў выгляд, што не звяртае на іх увагі. Сапраўды, хіба ў яго спраў іншых няма, як глядзець на гэтых дзяцей. Ён паважна падышоў да свайго коніка, які ўжо быў цалкам гатовы да падарожжа, уважліва праверыў аброць і папругу, а пасля накіраваўся да Яна, каб даведацца, ці не трэба яму чым дапамагчы. Але паміж гэтымі справамі Васілька раз-пораз употай


Брачыслаўль
Гарадзец
Мядзела

кідаў позіркі на купкі мясцовых дзетак, якія зачаравана назіралі за ім, бо ўжо ж вельмі прыемна было адчуваць сябе сапраўдным дарослым дружыннікам і разумець, што ўсе позіркі зараз скіраваныя менавіта на яго.

Тым часам Людаслаў развітаўся з мясцовым святаром і разам з Навумам падышоў да Яна і Васількі. Ён агледзеў свой невялікі атрад і загадаў сядаць на коней, пасля абняўся з гаспадаром Гарадца, ускочыў у сядло і скіраваўся да гарадской брамы. Дружыннікі рушылі за ім. Навум памахаў ім рукой, а мясцовы поп перахрысціў іх на дарогу.

Калі яны выехалі за гарадскую браму, Васілька спытаў у бацькі:

— А шмат такіх гарадоў у нашым княстве?

— Шмат, — адказаў Людаслаў, — і многія з іх нашмат большыя.

— І мы ўсе іх аб’едзем, — з надзеяй у голасе запытаў хлопчык.

— Не, Васілька, на тое, каб аб’ехаць іх усе, не хопіць, напэўна, і цэлага лета. А ў нас столькі часу няма, ды і мы не проста так вандруем, як ты ўжо ведаеш. У мяне ёсць заданне ад нашага князя Рагвалода, таму мы наведаем яшчэ адзін горад, які называецца Мядзелам, а пасля будзем вяртацца дадому.

Васілька засмуціўся.

— Не сумуй, сынок, будзе яшчэ ў тваім жыцці шмат выпраў, — весела сказаў бацька. — Паспееш пабачыць усе нашыя гарады, і не толькі нашыя.

Васілька ехаў побач з Янам і ўяўляў сабе гэтыя незлічоныя, яшчэ нябачаныя гарады. А паабапал сцяжынкі, па якой яны ехалі, цягнуліся лясы і пераleскі.

Так прайшло яшчэ тры дні. Іх шлях з незвычайнай прыгоды паступова ператвараўся для Васількі ў будзённы занятак. Ён ужо амаль не стамляўся ад доўгай язды на кані і ўвечары доўга сядзеў ля вогнішча і засынаў цяпер разам з усімі.

Аднойчы бацька нават даверыў яму вартаваць іх лагер уначы. Васілька ні на хвілінку не заплюшчыў вочы. Ён услухоўваўся ва ўсе чутныя начныя шорахі і пільна ўглядаўся ў цемру лясных гушчароў. Шмат разоў яму падавалася, што ў лясным падлеску нехта варушыцца і спрабуе патаемна падабрацца да іх невялічкага лагера. Васільку нават падавалася, што ён ужо бачыць паміж дрэвамі ці то цені, ці то варожых ваяроў, ці то нячысцікаў з лясных нетраў. Але кожны раз ён да самага апошняга моманту стрымліваўся, каб дарма не пабудзіць сваіх спадарожнікаў. Васілька больш баяўся, што бацькавы дружыннікі будуць з яго смяяцца, чым таго, што з ляснога гушчару хутка выскачыць нейкі нячысцік. Так ён прасядзеў цэлыя дзве гадзіны, пільнуючы сон сваіх спадарожнікаў.

Калі на чацвёртую раніцу яны зноў рушылі ў дарогу, Ян спытаў у Васількавага бацькі:

— Людаслаў, мы паспеем за сённяшні дзень дабрацца да Мядзела?

— Не ведаю, Ян. Хутчэй за ўсё, бліжэй да ночы дабяромся. А як не, то пашлём каго з хлопцаў наперад

сябе, а самі заначуем дзесьці на пад'ездзе да горада, — адказаў яму Людаслаў.

І яны зноў рушылі ў дарогу. За першую палову дня нічога незвычайнага не адбылося, яны ехалі па вузенькай лясной сцежцы, перасякалі шматлікія рачулкі і ручаіны і нават прамінулі дзве невялічкія вёсачкі, якія нечакана траплялiся падарожным паміж лясных гушчароў. Васількаў бацька з Янам пачалі ўжо абмяркоўваць, як іх будуць сустракаць у Мядзелі старыя сябры. Раптоўна з лясного гушчару пачуўся свіст, і адразу на Васільку і яго спадарожнікаў справа і злева паляцелі стрэлы. У першую секунду Васілька нават нічога не зразумеў. Ён толькі ўбачыў, як некалькі стрэл патрапіла ў каня Яна, які быў наперадзе іх невялічкага атрада, а адна страла праткнула сцягно маладому дружынніку Туне, што ехаў побач з Васількам, яшчэ адна страла ўтыркнулася ў шчыт, які быў прыладжаны да сядла Васількавага каня.

Нічога больш Васілька пабачыць не паспеў. Ён зразумеў, што на іх напалі ворагі. Калі хлопчык саскокваў са свайго каня, ён пачуў, як страшэнна захрыпеў у перадсмяротнай сутарзе паміраючы конь Яна. Краем вока Васілька паспеў пабачыць, як саскочылі з коней і падрыхтаваліся да бою яго бацька і астатнія дружыннікі. Хлопчык раптам зразумеў, што ён таксама трымае ў правай руцэ сваю суліцу.

Стрэлы яшчэ працягвалі ляцець, але Васількавы спадарожнікі паспелі добра схавацца, таму варожыя лукі былі для іх ужо амаль не страшныя. І ў гэты момант пачуўся страшэнны крык і з-за дрэваў на іх кі-

нуўся з дзясятак вояроў з вялікімі круглымі шчытамі і сякерамі ў руках. Сякеры былі з кароткімі рукаяцямі і вузкімі лёзамі, і Васілька адразу зразумеў, што гэта літоўцы, якіх яму даводзілася бачыць у родным Брачыслаўлі. Не паспеў хлопчык падумаць пра гэта, як гук выпушчаных з лукаў стрэлаў пачуўся і з іх боку. Двое літоўскіх вояроў упалі мёртвыя, а трэцяму страла патрапіла ў плячо — ён заенчыў і прываліўся да вялікага дрэва. Васілька агледзеўся і ўбачыў, што яго бацька, Ян і яшчэ двое дружыннікаў паспелі дастаць свае лукі.

І ў гэты момант літоўцы накінуліся на іх. Завязалася бойка. Васілька нічога не бачыў навокал, ён толькі паспеў заўважыць, як на параненага Туну накінуўся барадаты літоўскі вояр. Туна трымаў у руцэ меч, але з-за стралы ў сцягне не мог падняцца. Літовец ударыў параненага дружынніка сякерай, але той здолеў адбіць варожы ўдар. Васілька не стаў марнаваць час, падскочыў і з усяе сілы ўваткнуў сваю суліцу барадатаму літоўцу пад рэбры. Суліца ўвайшла ў цела ворага не надта глыбока, але той войкнуў, азірнуўся, і ў той жа момант Туна секануў яго мечам па нагах. Вораг рухнуў, але ў гэтае самае імгненне на спіну Васількі наваліўся страшэнны цяжар, які прыціснуў яго да зямлі. Хлопчык уткнуўся тварам у мох і ледзь не задыхнуўся пад тым, што звалілася на яго зверху. Пакуль Васілька спрабаваў выбрацца з-пад цяжару нерухомага цела мажнага літоўскага вояра, які на яго наваліўся, як грукат сечы неяк нечакана сціх.

Калі Василька ўжо амаль выбраўся з-пад цела літоўца, да яго падбег бацька і дапамог адкінуць мёртвага ворага.

— Ну як, сынок, не спужаўся? — спытаў ён у хлопчыка.

— Не, — толькі і здолеў адказаць Василька.

— Дзе там спужаўся, дзядзька Людаслаў, — сказаў паранены Туна. — Ён сваёй суліцай вунь таго літоўца праткнуў і жыццё мне ўратаваў.



# Дзіўны смак перамогі

Бойка была хуткацечнай. З Васількавых спадарожнікаў быў паранены толькі малады Туна, але рана яго была не надта сур'ёзнай, астатнія абышліся толькі лёгкімі драпінамі, на якія ніхто не звяртаў увагі. Апроч таго, літоўскія стрэлы забілі трох коней. А вось нападаючыя пакінулі на полі бою адразу пяцёра загінуўшых ваяроў. Яшчэ аднаго, таго, што быў паранены стралой у плячо на самым пачатку сутычкі, спадарожнікі Васількі ўзялі ў палон. Зараз ён сядзеў са звязанымі рукамі паміж сваіх загінуўшых суродзічаў.

Васількаў бацька і Ян раіліся аб тым, як быць далей.

— Што рабіць будзем, Яне? — сказаў Людаслаў. — Пасняшаемся да Мядзела ці крыху перавядзём дух тут?

— Мяркую, што можна і адпачыць, перавязаць параненага, — адказаў Ян. — Не думаю, што яны наважацца зноў на нас напасці. Мы ж, пэўна, палову з іх перабілі ці паранілі.

— Мусіць, ты праў, — задуменна сказаў Людаслаў. — Добра, хлопцы, перавяжыце Туну, агледзь-

це коней ды пільнуйце гэтага, каб не збег — паказаў ён на палоннага. — Ну і яго перавяжыце таксама, бо ён нам патрэбны жывым.

Пасля гэтага бацька падышоў да Васількі.

— Ну што, сынок, як ты? — запытаў у яго бацька.

— Добра, са мной нічога не здарылася. Шкада, што я вам мала чым змог дапамагчы, — адказаў хлопчык.

— Нічога сабе, мала! Каб не ты, мо Туна ўжо б і жывым не быў! Ты ў мяне малайчына! — шчыра сказаў Людаслаў.

Васільку было дужа прыемна, што бацька яго так хваліць. Ды і ўсе астатнія дружыннікі казалі яму, што ніколі яшчэ не бачылі такога смелага і спрытнага мальца, як ён. Але адчуванне ўсё ж было дзіўнае. Васілька столькі марыў пра сапраўдныя ваярскія прыгоды, але ён ніколі не задумваўся, што падчас бойкі ліецца столькі крыві і што пасля сечы на зямлі застаюцца нерухомыя целы. Напэўна, упершыню ў сваім жыцці хлопчык падумаў, што ваярская справа — гэта не толькі прыгоды і далёкія падарожжы, але і кроў, і вялікая небяспека, і нават магчымасць згубіць жыццё. Нездарма ж усе так паважаюць і шануюць дружыннікаў... Але заглыбіцца ў думкі Васільку не далі — надта шмат было для ўсіх працы.

Васільку давялося дапамагаць спадарожнікам расцугляць загінуўшых коней, перапакаваць іх паклажу, сабраць трафеі. Пасля гэтага атрад рушыў далей. Васількаў бацька і Ян вырашылі, што да Мядзела да цемры яны дабрацца ўжо не паспеюць, таму варта заначаваць недзе ў лесе.

Рэшту шляху, пакуль не пачало змяркацца, яны імкнуліся рухацца як мага цішэй, хаця ўсе і меркавалі, што новых варожых нападаў больш не будзе. Бліжэй да ночы Васількаў бацька загадаў збочыць са сцежкі. Яны знайшлі невялічкую паляну, хутка павячэралі, не распальваючы вогнішча, і сталі рыхтавацца да сну, пакінуўшы на ноч двух вартавых. Астатнія дружыннікі хутка заснулі.

Васілька, ухутаны ў цёплы ваўняны плашч, ляжаў побач з бацькам, але заснуць хутка, як дарослыя, не мог. Хлопчык думаў пра тое, што сёння ён мог загінуць, і яго бацька таксама мог загінуць, і Ян, і астатнія іх спадарожнікі. А малады Туна быў паранены. Да гэтага часу Васілька ніколі не думаў пра смерць. Ён шмат разоў бачыў хаўтуры. Бачыў, як плачуць сваякі над нябожчыкам, бачыў, як адпявае памерлых іх брачыслаўскі поп Лазар, бачыў, як насыпаюць над пахаванымі курганныя насыпы. Але гэта ўсё былі чужыя для яго людзі, ён іх ведаў, але яны не былі яму родныя і блізкія. А вось сёння ён убачыў, як мог бы загінуць яго бацька, і сам ён таксама мог бы загінуць. Васілька думаў пра тое, што з ім было б, каб літоўская страла пацэліла ў яго. Што з ім было б на тым свеце? Ці патрапіў бы ён у рай? Ці ён ужо шмат паспеў награшыць, і пасля смерці яго чакала б пекла, пра якое столькі распавядаў ім на занятках у царкве Лазар...

# Мядзела

На самым світанні атрад зноў рушыў у дарогу. Сцежка, па якой яны ехалі, паступова станавілася ўсё больш наезджанай і шырокай. Як толькі паабапал гэтай дарогі з'явіліся разараныя палеткі, яны ўбачылі наперадзе пыл, які ўздымаў атрад вершнікаў, што імчаліся ім насустрач. Гасцята загадаў усім рыхтавацца да бою. Усе дружыннікі дасталі лукі і нацягнулі іх, каб сустрэць магчымага ворага на як мага большай адлегласці. Тыя, хто імчаўся ім наперад, заўважылі атрад Васількавых спадарожнікаў і запаволілі коней. Толькі адзін з іх ехаў наперад гэтак жа хутка, як і раней. Васількаў бацька скіраваў свайго каня насустрач незнаёмаму вершніку, і ўжо праз нейкія метраў трыццаць ці сорак ён махнуў сваім спадарожнікам рукой, а гэта значыла, што небяспекі няма. Калі Васількаў бацька зблізіўся з незнаёмым ваяром, яны па-сяброўску абняліся і аб нечым загаманілі. Атрады рушылі насустрач адно аднаму.

Гэта былі не ворагі, а дружыннікі і гараджане з Мядзела. Усе яны былі добра ўзброеныя і, відавочна, падрыхтаваныя ў кожны момант уступіць у бой-



ку. Выявілася, што атрад быў пасланы з горада, каб шукаць банду літоўцаў, што ўчора напала на Васількавых спадарожнікаў. Бацька Васількі хутка распавёў пра ўчарашнюю сутычку, і мядзелскія ваяры паімчаліся да месца, дзе адбылася бойка. Толькі адзін з іх, зусім яшчэ малады хлопец, па ўсім відаць не з дружыннікаў, а з гарадскіх рамеснікаў, застаўся з ім, каб суправаджаць гасцей з Брачыслаўля да свайго горада.

Ехалі няспешна, бо былі ўпэўненыя, што ніякай небяспекі больш няма. Таму нават зрабілі доўгі прывал на беразе нейкай рэчкі, дзе адпусцілі стрыножаных коней пасвіцца на поплаве, а самі добра пад'елі. Васілька нават паспеў заснуць, лежачы на мяккім імху пад промнямі цёплага сонейка.

У другой палове дня атрад на чале з Васількавым бацькам дабраўся да Мядзела. Васілька ўбачыў доўгі шэраг хат, якія цягнуліся ўздоўж берага вялізнага возера. Але сярод хат нідзе не было бачна царквы, ды і ніякага вала з драўлянымі сценамі вакол паселішча не было. Васілька вельмі здзівіўся, як гэта можа быць — горад без вала са сценамі?

— Гэта і ёсць Мядзела? — расчаравана запытаўся ён у бацькі.

— Не, што ты, — адказаў той з усмешкай, — глядзі ўважлівей.

З гэтымі словамі Людаслаў паказаў рукой у бок цэнтра возера. Васілька прасачыў за бацькавай рукой і адразу ж усё зразумеў. Пасярод возера месціўся вялікі востраў. Яго ўсходнюю частку займаў замак са стром-

кімі валамі, такімі ж, як у Брачыслаўлі і Гарадцы, і высокімі сценамі. Адразу за замкавым ровам раскінулася вялікае паселішча, якое займала амаль палову вострава. Угледзеўшыся яшчэ больш пільна, хлопчык пабачыў, што асобныя дамкі стаяць і на некалькіх маленькіх астравах, ды і на супрацьлеглым беразе можна было заўважыць некалькі купак дамкоў — асобныя вёсачкі. Пакуль Васілька разглядаў возера і замак на востраве, ён паспеў пачуць, што тое паселішча, куды яны прыехалі, завецца ў мядзелцаў Перадградздзем.

У Перадграддзі яны пакінулі сваіх коней і паселі ў чоўны, бо дабрацца да самога Мядзела можна было толькі па вадзе. Васілька любіў чоўны. Ды і як магло быць іначай, бо яго Брачыслаўль з усіх бакоў абкружаны азёрамі. З самага дзяцінства Васілька і яго аднагодкі вучыліся плаваць, веславаць, лавіць рыбу. А ўжо гадоў з дзесяці бацькі пачыналі вучыць хлапчукоў, як правільна выбраць дрэва і што варта рабіць, каб змайстраваць лёгкі, але трывалы і спраўны човен. Але ў Брачыслаўлі з чоўнаў лавілі рыбу ды ў добрае надвор'е плавалі на супрацьлеглы бок велізарнага возера Дрывяты, бо каб аб'ехаць яго цалкам, не хапала цэлага дня. А вось жыхары Мядзела праводзілі на вадзе добрую частку жыцця, бо іначай ні патрапіць у іх горад, ні выбрацца з яго ў навакольны свет было немагчыма.

Калі човен, у якім сядзелі Васілька, яго бацька і яшчэ двое дружыннікаў, ужо набліжаўся да берага, на яго выйшаў высокі чалавек з доўгімі сівымі валасамі.

Ён быў ужо сталага веку, напэўна, старэйшы за Васількавага бацьку, але адразу было бачна, што яшчэ вельмі моцны і здаровы. І хаця быў апрануты, як звычайны селянін ці гараджанін — у простыя адбеленыя штаны, закатаныя да калена, і такую ж кашулю, адзінае, што яго адрознівала ад простых мядзелцаў, — багата аздоблены срэбнымі накладкамі пас, адразу было бачна, што гэта мясцовы гаспадар.

Нарэшце човен уткнуўся носам у пясчаны бераг вострава, бацька Васількі спрытна саскочыў з яго і пайшоў насустрач сівавалосаму чалавеку. Той рушыў наперад, і яны абняліся.

— Што ж гэта ў цябе ў воласці адбываецца такое, Хацен? — ці то жартаўліва, ці то зусім сур'ёзна запытаўся ў мядзелскага гаспадара бацька Васількі. — Не паспелі мы на тваю зямлю заехаць, як на нас нейкая банда літоўцаў напала, ледзьве адбіліся! Добра, што ўсе жывыя засталіся, толькі аднаго майго мальца падстрэлілі, але з ім усё добра будзе. У цябе што вайна з літвой пачалася?

— Ды што ты, Людаслаў! Якая там вайна?! — сур'ёзна адказаў сівавалосы Хацен. — Я ж толькі той восенню за сына свайго суседа Нецімера малодшую дачку аддаў, пародніліся мы з ім, зараз унукаў чакаем.

— Хто ж тады на нас напаў? — запытаўся Людаслаў. — Вунь, мы аднаго нават злавілі, — сказаў ён і паказаў на човен, у якім сядзеў звязаны палонны літовец. — Мо скажаш, што і гэта твой кум?

— Можа каму і кум, але не мне. Гэтыя літоўцы выгнаннікі — яны чымсьці правініліся перад Неці-

мерам. Вось ужо амаль месяц, як толькі снег сышоў, яны пачалі рабаваць на памежжы, што свае літоўскія, што нашы крывіцкія вёскі. І ніяк мы іх вылавіць не маглі.

— Ну то кажы нам дзякуй, бо мы, пэўна, палову з іх учора перабілі, за цябе тваю справу зрабілі, — з усмешкай сказаў Людаслаў. — Таму даставай найлепшы мёд, будзеш маіх мальцаў частаваць за такую працу!

— Будзь упэўнены, мёду будзе ўдосталь, стоміцеся піць, — з яшчэ больш шырокай усмешкай адказаў яму Хацен. — А заўтра ці паслязаўтра паедзем у госці да Нецімера, каб завезці яму гэтага злодзея, хай сам з ім разбіраецца.

Гаспадар Мядзела і Васількаў бацька рушылі ў бок адной з вуліц, што вяла да пляца, на якім стаялі царква і самы вялікі дом. За імі пацягнуліся ўсе астатнія. З усіх падворкаў і з-за ўсіх платоў на гасцей глядзела шмат народу, асабліва цікавіліся хлапчукі і дзяўчынкі, але Васілька ўжо зусім не звяртаў на іх увагі, бо пасля ўчарашняй бойкі з літоўцамі ён адчуваў сябе амаль дарослым, ды і яго спадарожнікі сталі глядзець на хлопца неяк інакш, прынамсі, зусім інакш, чым на іншых яго пагодкаў.

У вялікай святліцы за доўгім і шырокім дубовым сталом сабраліся ўсе мядзелскія дружыннікі. Пасярод стала, на самым пачэсным месцы сядзелі Хацен ды Васількаў бацька. Васільку пашчасціла сядзець зусім блізка ад старэйшых, бо яго пасадзіў каля сябе малады дружыннік Туна, які распавядаў таварышам пра тое, як хлопчык уратаваў яму жыццё. Васілька

быў вельмі ўзрушаны ад таго, што апынуўся ў цэнтры ўвагі ўсіх мядзелскіх дружыннікаў. Цэлы вечар ён слухаў размовы свайго бацькі з Хаценам. Цяпер ён зразумеў, што князь Брачыслаў рыхтуе будучай зімой выправу на поўнач, на вялікі горад Ноўгарад, і для гэтага яму спатрэбяцца ўсе дасведчаныя ваяры з усіх падуладных Полацку зямель. Людаслаў таксама запытаў у Хацена, ці захочуць суседнія літоўцы прыняць удзел у выправе, бо яна абяцае велізарную здабычу.



# Пасольства

Наступны дзень Людаслаў і яго дружыннікі адпачывалі і папраўлялі рыштунак. Васілька заставаўся пры бацьку, бо справа для яго ўвесь час знаходзілася, а ісці гуляць з мясцовымі дзецьмі хлопчыку не хацелася, бо што з іх, малых, узяць.

На другі дзень з самага ранку Хацен з Людаславам сталі збірацца ў госці да суседняга літоўскага правадыра Нецімера. Васілька ўвесь час завіхаўся побач са старэйшымі, дапамагаў ім пераносіць рэчы і ўкладаць іх у чоўны і ўвесь час употай паглядаў на бацьку. Хлопчык вельмі хацеў выправіцца ў дарогу разам з бацькам, каб паглядзець на тое, як жывуць гэтыя літоўцы. Але прасіцца, каб яго ўзялі з сабой, ён не адважваўся. Калі ўжо ўсё было падрыхтавана і дружыннікі паселі ў чоўны і ўзяліся за вёслы, на беразе засталіся толькі Хацен і Васількаў бацька, якія пра нешта ціха размаўлялі паміж сабой. Нарэшце Хацен паглядзеў на Васільку і з хітрынкай у вачах запытаў у яго:

— А што, малец, хацеў бы ты паехаць з намі?

У Васількі ажно пераняло мову ад радасці.

— Я б цябе можа і ўзяў, — працягнуў Хацен, — але ці пагодзіцца твой бацька?

Васілька ўмольна паглядзеў на свайго бацьку, які выглядаў у гэты момант надзвычай суровым, і падавалася, што ён дужа не задаволены задумай Хацена. Але раптам ён шчыра рассмяяўся і сказаў:

— Сядай ужо ў човен, куды ж мы без такога знакамітага ваяра, як ты.

Васілька не прымусіў сябе чакаць і імгненна ўскочыў у бліжэйшы з чоўнаў. Людаслаў і Хацен таксама селі ў найвялікшы з чоўнаў і загадалі сваім людзям веславаць у бок Перадграддзя. Там Васількавых спадарожнікаў ужо чакалі асядланыя коні, таму атрад амаль без затрымкі выправіўся ў дарогу. Бацька сказаў Васільку, што да замка Нецімера ім давядзецца ехаць амаль цэлы дзень. Так яно і атрымалася. Атрад на чале з Хаценам і Людаславам увесь час ехаў па дастаткова шырокай і добра наезджанай дарозе, уздоўж якой часта сустракаліся невялічкія вёсачкі, якія звычайна стаялі на берагах азёраў рознага памеру.

Бліжэй да поўдня дарога, па якой пралягаў шлях Васількі і яго спадарожнікаў, выйшла да берага вялізнага возера. Хаця хлопчык і нарадзіўся на беразе вельмі вялікага возера і паспеў ужо пабачыць шмат іншых немалых азёраў, але ад таго, што ён убачыў цяпер, Васілька быў проста ў захапленні. Ён нават падумаў, ці не тое гэта неабсяжнае мора, у якое ўпадае Дзвіна. Васільку настолькі захапіла гэтае пытанне, што ён наважыўся патурбаваць свайго бацьку ды Хацена. Тыя толькі рассмяяліся ў адказ.

— Не, Васілька, ніякае гэта не мора, — весела сказаў Хацен, — гэта возера, якое завецца Нарач. Яно

сапраўды вельмі вялікае, напэўна, самае вялікае возера нашага краю, хаця я, канешне, усіх азёраў не бачыў. Але ў маёй воласці, ды і ў суседніх таксама, яно самае вялікае.

— А мора, сынок, яшчэ большае, нашмат большае, — падхапіў размову Васількаў бацька. — Я сам яго бачыў толькі аднойчы, калі па княжацкім загадзе ездзіў прадаваць футры ды воск на далёкі востраў Готланд. Па моры можна плыць тыднямі і месяцамі. Людзі, што жывуць на тым востраве, ды іншыя людзі, купцы з краінаў шведаў ці датчан, казалі, што, колькі яны ні хадзілі ў мора ў самыя розныя бакі, ніколі не бачылі яго меж. А яшчэ вада ў моры зусім не такая, як у нашых азёрах і рэках, яна салёная і піць яе нельга.

Васілька вельмі здзівіўся, як жа гэта вада можа быць салёнай і як яе можна піць? Хлопчык падумаў, што ён бы не хацеў жыць на беразе мора, вада ў якім ні да чаго непрыдатная, і што свае азёры яму падабаюцца больш.

Яны ехалі ўздоўж Нарачы гадзіны са дзве, а можа і ўсе тры. Нарэшце Хацен загадаў спыніцца на прывал.

— Вось тут мяжа нашай зямлі, можна і прыпыніцца, адпачываць заўжды лепш на сваёй зямлі, — сказаў ён.

Адпачывалі доўга, гадзіны дзве. Мядзелскія ваяры паспелі раскласці вогнішча і падсмажыць мяса, а Васілька, пакуль старэйшыя гатавалі ежу ды даглядалі коней, паспеў збегаць да возера і памачыць у ім ногі. Купацца ён не адважыўся, бо вада была яшчэ занадта

халоднай. Увесь гэты час хлопчык думаў пра тое, як жа гэта цудоўна, што вада ў нашых азёрах не салёная.

Пасля прывалу атрад заглыбіўся ў лес. Дарога, па якой яны ехалі, заставалася наезджанай і досыць шырокай, але ніякіх слядоў чалавечага жытла паабапал яе не было. Спадарожнікі патлумачылі Васільку, што гэта памежная зямля, нічыйны лес — за іх спінамі засталася Мядзелская воласць, а за лесам пачынаюцца землі літоўцаў. А дарога тут такая добрая, бо па ёй возяць розныя тавары з воласці, падуладнай Хацену, у зямлю Нецімера, прычым тут часам праязджаюць і купцы з аддаленых краёў.

Атрад рухаўся па лесе гадзіны са тры. Васілька ехаў адразу за бацькам і Хаценам і ўвесь час задаваў ім розныя пытанні, а яны з ахвотай адказвалі. У нейкі момант Людаслаў запытаўся:

— Васілька, а што ты бачыш за дрэвамі злева?

Хлопчык стаў углядацца ў лясны гушчар, але нічога пабачыць там так і не здолеў.

— Не ведаю, — адказаў ён, — здаецца, нічога там няма. — А што?

— Эх, малец, вучыцца табе яшчэ і вучыцца, — усміхнуўся Хацен. — За намі ўжо з паўгадзіны сочаць літоўскія вартавыя. Хутка яны нас сустрэнуць.

І сапраўды, праз некалькі хвілін на дарогу з ляснога гушчару выйшлі два літоўскія ваяры. Хацен выехаў ім насустрач і загаманіў па-літоўску. Васілька не ведаў літоўскай мовы. Ён чуў яе часам у родным Брачыслаўлі, калі туды прыязджалі гандляваць суседнія літоўцы, але амаль нічога не разумеў. Нават

не ведаючы літоўскай мовы, хлопчык зразумеў, што гаворка ў Хацена з вартавымі ідзе прыязная і ніякай небяспекі няма. І сапраўды, праз некалькі хвілін літоўцы зноў зніклі ў лесе, а Хацен падаў сваім спадарожнікам знак, што можна спакойна рухацца далей.

У хуткім часе ўздоўж дарогі сталі з'яўляцца асобныя хаты і цэлыя літоўскія вёсачкі. Васілька пільна ўглядаўся, але асаблівых адрозненняў ад звычайных крывіцкіх вёсак так і не знайшоў. Усё выглядала навокал гэтаксама, як і дома. Адзіным адрозненнем было тое, што людзі размаўлялі на чужой мове, ды жанчыны былі апранутыя крыху інакш, чым крывічанкі.

Пад вечар Васількавы спадарожнікі нарэшце дабраліся да замка, якім валодаў Нецімер. Замак стаяў на высачэзнай гары на беразе доўгага возера, якое называлася Свір. Калі атрад на чале з Хаценам і бацькам Васількі даехаў да самага замкавага пагорку, стала бачна, наколькі ў яго стромкія схілы. Заехаць на гэтую гару на конях было проста немагчыма, таму давялося спяшацца і пакінуць коней слугам Нецімера. Пасля гэтага Васілька і яго спадарожнікі доўга падымаліся па спіральнай сцежцы да замкавай брамы, дзе іх ужо чакаў Нецімер з жонкай і некалькімі ваярамі. Нецімер трымаў у руках вялізны піцейны рог, напоўнены мёдам. Пакуль Хацен і Людаслаў віталіся з літоўскім уладаром і абменьваліся падарункамі, Васілька з цікаўнасцю разглядаў ваяроў Нецімера. Тыя былі ўзброены вузкімі сякерамі і коп'ямі, на паясах у іх віселі доўгія нажы ў похвах, а на руках у кожнага з літоўцаў



было па адным, а ў некаторых і па два масіўных бранзавых бранзалеты.

Калі прывітальныя прамовы былі скончаны і адбыўся абмен падарункамі, дружыннікі аддалі Нецімеру палоннага літоўца-рабаўніка, каб той судзіў яго па сваіх законах. Пасля ўсе рушылі ўнутр замка, пляцоўка якога аказалася зусім маленькай. На ёй змяшчалася ўсяго некалькі невялікіх дамоў, у адным з якіх жыў сам Нецімер, а астатнія займалі яго ваяры.

Увесь вечар гаспадар і яго госці піравалі і абмяркоўвалі розныя справы. Васілька мала што разумеў з гэтых размоў, бо ўсе гаманілі пераважна па-літоўску. Пад дзіўныя гукі чужой мовы хлопчык павoлі задрамаў і заснуў, ухутаны ў мядзведжае футра.

На раніцу, калі Васілька прачнуўся і выйшаў з дома, ён убачыў, як яго бацька і Хацен зноў рыхтуюцца ў дарогу. Хлопчык падбег да бацькі і радасна запытаўся, куды яны зноў едуць.

— Мы з Хаценам ды яго дружыннікамі паедзем далей, у глыб літоўскіх зямель, — адказаў Людаслаў, — а ты, сынок, разам з дзядзькам Янам вернешся назад у Мядзела і будзеш мяне там чакаць.

— А хіба мне нельга паехаць з вамі? — засмуціўся Васілька.

— Не, далей табе нельга, — сказаў Людаслаў. — Хай сабе ў нас зараз і мір з літоўцамі, але ўсё ж табе яшчэ з намі ехаць рана.

Васільку страшэнна хацелася пабачыць далёкія літоўскія землі, але пярэчыць бацьку ён не адважыўся, бо ўжо зразумеў, што сапраўды дарослы чалавек

мусіць падпарадкоўвацца старэйшым, нават калі яму гэта і зусім не даспадобы.

Хацен і Васількаў бацька развіталіся з Нецімерам і разам са сваімі спадарожнікамі спусціліся з замкавага пагорка, дзе іх ужо чакалі асядланыя коні. Тут Людаслаў абняў Васільку і наказаў ва ўсім слухацца Яна і ў хуткім часе чакаць яго. Пасля гэтага яны з Хаценам і атрадам дружыннікаў рушылі на захад, у глыб літоўскіх зямель, а Васілька з Янам і адным з мядзелскіх ваяроў скіравалі сваіх коней на ўсход, у бок Мядзела.



# Вяртанне

Увесь наступны тыдзень Васілька правёў у Мядзелі, прычым сумаваць яму не давялося. Штодня з самага ранку хлопчык пад наглядам Яна займаўся ваярскімі практыкаваннямі: бегаў, скакаў, практыкаваўся біцца на мячах і сякерах, кідаць суліцы. Па абедзе Васілька зноў практыкаваўся ў фехтаванні, але цяпер ужо з драўлянымі мячамі з сынамі мядзелскіх дружыннікаў. Спярша іншыя хлопцы пабойваліся Васільку, бо аднекуль даведаліся пра тое, як ён паўдзельнічаў у сутычцы з бандай літоўцаў. Мусіць, пра гэта ім распавялі іх бацькі. Сам Васілька нікому са сваіх пагодкаў пра той выпадак нічога не распавядаў. Але ўжо ў хуткім часе ён пасябраваў з мядзелскімі хлапчукамі і ў вольны час гуляў з імі ў біты, у мяч і ў іншыя гульні. А яшчэ Васілька дапамагаў Яну і Туне, які ўжо стаў папраўляцца ад сваёй раны, даглядаць коней і чысціць зброю, назіраў, як працуюць мядзелскія рамеснікі, кавалі, ювеліры і ганчары і нават крыху ім дапамагаў. Найбольш яму падабалася глядзець за працай ганчара, які рабіў на сваім крузе самыя розныя гаршкі, кубкі і міскі. А асабліва Васільку было даспадобы самому рабіць з гліны розныя рэчы — маленькія

кубачкі і розныя цацкі. Мядзелскі ганчар Гаўка хваліў Васількаву працу, хаця вытачыць на крузе цэлы гаршчок у хлопчыка пакуль не атрымоўвалася.

Роўна праз тыдзень вярнуліся з літоўскіх зямель Хацен і Васількаў бацька. Падчас піру з нагоды іх вяртання, куды бацька ўзяў і Васільку, усе былі ў добрым гуморы. З размоў, што вялі Людаслаў і Хацен з Янам і старэйшымі мядзелскімі дружыннікамі, хлопчык зразумеў, што пасольства прайшло паспяхова і яго бацька вельмі задаволены яго вынікамі.

Яшчэ два дні пасля вяртання з літоўскай зямлі Васількаў бацька і яго спадарожнікі адпачывалі і праводзілі вольны час у розных забавах. Бацька пачаў вучыць Васільку гуляць у таўлеі — складаную гульню, за якой дужа любілі бавіць вольны час дружыннікі. Спярша яны малявалі поле гульні на пяску, а замест фігурак збіралі рознакаляровыя каменьчыкі. А ў апошні вечар перад ад'ездам Васілька нават згуляў з Хаценам у яго ўласныя таўлеі, дзе фігуркі былі зробленыя з рознакаляровага шкла, а цэнтральная фігурка князя нават нагадвала чалавека. Фігуркі расстаўляліся на вялікай дошцы, упрыгожанай разьбяным арнаментам. Хацен сказаў, што фігуркі гэтыя яму прывезлі аднекуль з-за мора, ці то з краіны шведаў, а можа нават і з далёкіх зямель франкаў. Васілька некалькі разоў прайграў Хацену, але ён зусім не засмуціўся, бо проста перастаўляць на дошцы такія прыгожыя фігуркі было прыемна ўжо само па сабе.

Нарэшце ўсе прыгатаванні да вяртання дадому былі завершаны і можна было выпраўляцца ў зварот-

ны шлях. Хацен даў брачыслаўскім дружыннікам у дарогу шмат прыпасаў і розныя падарункі. Васільку ад мядзелскага гаспадара дастаўся масіўны бронзавы бранзалет, а яго сястрычцы Мілаславе нізка рознакаляровых шкляных пацерак.

Пасля доўгіх развітанняў брачыслаўскія ваяры рушылі ў зваротны шлях. Яны вярталіся той жа самай дарогай, што ехалі сюды, але наваколле за час іх знаходжання ў Мядзелі паспела ўжо крыху змяніцца — наступіла сапраўднае лета. Надвор'е было вельмі цёплым, і ўвесь час свяціла ласкавае летняе сонейка. Рухаліся няспешна, але гэтым разам у Гарадзец заязджаць не сталі. Замест гэтага Васількаў бацька адаслаў Яна і яшчэ аднаго маладога дружынніка ў Полацк, каб перадаць князю Брачыславу звесткі, сабраныя падчас



іх выправы па памежжы з літоўцамі. Васільку было вельмі зайздрасна, бо яму таксама дужа хацелася пабываць у сталіцы, а магчыма і пабачыць вялікага князя Брачыслава.

— А чаму мы ўсе не можам паехаць у Полацк? — запытаў ён у бацькі.

— А дома хто будзе справамі займацца? — адказаў той. — Мы ўжо доўга вандруем, трэба і дахаты завітаць, паглядзець, як там справы ідуць. А ў Полацку ты яшчэ пабываеш не раз. А гадкі праз тры-чатыры і ўвогуле паедзеш да двара князя Брачыслава, як калісьці твае старэйшыя браты.

Васілька крыху засмуціўся, але пасля падумаў, што ў Полацк яму, канешне, вельмі хочацца, але і дадому хочацца таксама. Ён зразумеў, што паспеў ужо засумаваць па маці, сястрычцы і сябрах.

Нарэшце надвячоркам сёмага дня Васілька ўбачыў сцены Брачыслаўля, што ўзвышаліся на гары паміж азёраў. Толькі тут хлопчык зразумеў, наколькі ж ён, насамрэч, паспеў засумаваць па родным горадзе. Калі атрад на чале з Васількавым бацькам наблізіўся да гарадской брамы, іх ужо сустракаў натоўп гараджан. Наперадзе ўсіх стаяў Давыд, а побач з ім Васілька ўбачыў сваю маці і сястрычку Мілаславу. Вершнікі спешыліся. Васількаў бацька спярша абняўся з Давыдам і запытаў у яго, ці ўсё было добра ў Брачыслаўлі ў іх адсутнасць. Давыд адказаў, што ўсё ў горадзе і воласці спакойна і ніякіх здарэнняў за час іх адсутнасці не адбылося. Пасля гэтага Людаслаў падхапіў на рукі дачку, абняў жонку і сказаў:

— Ну вось бачыш, і месяца не прайшло як мы вярнуліся. Глядзіце, як наш Васілька падрос і памацнеў за гэты час. А каб ты ведала, колькі ён подзвігаў зрабіць за гэты час паспеў!

— Ды што мне вашыя подзвігі! — адказала Васількава маці. — Галоўнае, што жывыя і здаровыя вярнуліся, — і чамусьці заплакала.

Пасля радасных прывітанняў усе сталі разыходзіцца па дамах. Рушылі дадому і Васількавы бацька з маці, а да самога Васількі падбеглі яго сябрукі і сяброўкі і сталі пытацца, што ён паспеў пабачыць падчас сваёй выправы і што з ім за гэты час адбылося. Васілька быў вельмі рады ўсіх бачыць, але яшчэ больш ён хацеў хутчэй трапіць у родную хату, таму паабяцаў усім, што распавядзе пра свае прыгоды на наступны дзень.

Дома Васілька адразу падарыў сваёй сястрычцы нізку рознакаляровых шкляных пацерак, прывезеных з Мядзела, а пасля ўволю наеўся маміных прысмакаў. Перад сном ён уяўляў, як заўтра будзе распавядаць сваім сябрам пра тое, што бачыў у дарозе. А яшчэ ён падумаў, што самае лепшае ў кожным падарожжы — гэта вяртанне дадому.



# Змест

ВЯСНА . . . 3
КРЫНІЦА . . . 10
НАВУКА . . . 16
ГАНЕЦ . . . 20
НЕЧАКАНАЯ РАДАСЦЬ . . . 23
ВЫПРАВА . . . 26
ГАРАДЗЕЦ . . . 33
РАПТОЎНАЯ НЕБЯСПЕКА . . . 38
ДЗІЎНЫ СМАК ПЕРАМОГІ . . . 45
МЯДЗЕЛА . . . 48
ПАСОЛЬСТВА . . . 55
ВЯРТАННЕ . . . 63

Літаратурна-мастацкае выданне

**Плавінскі** Мікалай Аляксандравіч

**ПРЫГОДЫ ВАСІЛЬКІ З БРАЧЫСЛАЎЛЯ**

Рэдактар *В. М. Пінчук*
Мастак *К. Г. Фурс*
Мастацкі рэдактар *Н. Р. Агародная*
Тэхнічны рэдактар *Ж. М. Бароўская*
Карэктары *В. І. Смірнова, Л. К. Сямёнава*

Падпісана да друку 13.09.2016. Фармат $70 \times 100^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура «Таймс». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 5,85. Ул.-выд. арк. 3,6. Тыраж 1300 экз. Зак. 866.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь. http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

# ХУДОЖЕСТВЕННАЯ ЛИТЕРАТУРА ДЛЯ ДЕТЕЙ

## ВОЛШЕБНЫЙ МИР СКАЗОК




ISBN 978-985-01-1182-1

Издательство «Беларусь»

Авторы: Алесь Мартинович,

Геннадий Авласенко и др.

Год выпуска: 2016

Тираж: 1300 экз.

Страниц: 432

Тип обложки: переплет

Язык: русский

Иллюстрации:без иллюстраций

Читатель познакомится с самыми необычными сказочными героями, с волшебными историями, которые приключились с ними, побывает в разных странах, перенесется из зимы в лето, узнает о повадках зверей и птиц и еще о многом интересном.

## КАЗКІ СІНЯВОКАЙ ЗЯМЛІ




ISBN 978-985-01-1167-8

Выдавецтва «Беларусь»

Аўтар: Таццяна Дамаронак

Год выдання: 2016

Тыраж: 1300 экз.

Старонак: 160

Тып вокладкі: пераплёт

Мова: беларуская

Ілюстрацыі: каляровыя

Адправіўшыся ў віртуальнае вандраванне па родным краі разам з дапытлівымі героямі казак, чытач даведаецца пра багацце беларускіх лясоў, рэк і азёр. А яшчэ сустрэне новых добрых сяброў.

## ПРИКЛЮЧЕНИЯ КРОТИКА И ЕГО ДРУЗЕЙ




ISBN 978-985-01-1178-4

Издательство «Беларусь»

Автор: Наталия Новаш

Год выпуска: 2016

Тираж: 1300 экз.

Страниц: 191

Тип обложки: переплет

Язык: русский

Иллюстрации: цветные

В фантастической истории рассказывается об увлекательных приключениях Кротика, Бегемотика и их друзей. Вы узнаете, что если что-то очень захотеть, то могут исполниться все желания; какая бывает дружба и где ее искать.

## НОВЫЙ ГОД У ТЁТИ ЁЛКИ И ДРУГИЕ СКАЗКИ




ISBN 978-985-01-1103-6

Издательство «Беларусь»

Автор: Карина Пашкевич

Год выпуска: 2014

Тираж: 2000 экз.

Страниц: 192

Тип обложки: переплет

Язык: русский

Иллюстрации: цветные

Герои этого сборника сказок — веселый пчеленок Май, добросовестный кузнечик Гордей, вредный маленький Мух, испанский дракончик Пако, шаловливый броненосец Бронька, умный и рассудительный дед Гамак, душевная тетя Елка, а также их верные друзья и товарищи — не оставят равнодушными к происходящему как маленьких читателей, так и их родителей. Первые увидят в некоторых персонажах сказок самих себя, а вторые вспомнят свое ушедшее детство.

## МЫ — МАЛЕНЬКИЕ: СТИХИ ДЛЯ ДЕТЕЙ




ISBN 978-985-01-1137-1

Издательство «Беларусь»

Автор: Янина Георгиевна Жабко

Год выпуска: 2016

Тираж: 1100 экз.

Страниц: 54

Тип обложки: мягкая

Язык: русский

Иллюстрации: цветные

Стихи Янины Жабко, написанные для детей от полутора до трех лет, знакомят малышей с окружающим миром, развивают и обогащают личность ребенка. Для родителей, воспитателей, студентов педагогических специальностей.

## МАЛЬЧИК С ЗЕЛЕНЫМИ ВОЛОСАМИ. ПЛЕННИКИ ЛАБИРИНТА




ISBN 978-985-01-1176-0

Издательство «Беларусь»

Автор: Наталия Новаш

Год выпуска: 2016

Тираж: 1300 экз.

Страниц: 423

Тип обложки: переплет

Язык: русский

Иллюстрации: цветные

В первой повести читатель погружается в сказочный и удивительный мир, где возможны перемещения во времени, исполнение самых заветных желаний и необычные открытия древних тайн. Главный герой Славик — третьеклассник из научного городка, построенного в загадочной Аномальной Зоне лесного заповедника, — отправится с читателями в самые невероятные приключения. Во второй фантастической повести Славик и его друзья столкнутся с загадочными обстоятельствами, которые могут угрожать всем жителям Земли. Действовать нужно без промедления!

Для среднего школьного возраста.

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»
ISBN 978-985-01-1184-5
9 789850 111845
htt:// belarusbook.by
EAC